# Другія Тышкевіцкія чытанні ў Лагойску

16 кастрычніка на базе Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя К. і Я. Тышкевічаў прайшла абласная навуковая канферэнцыя – «Другія Тышкевіцкія чытанні». Удзельнікі і госці канферэнцыі (супрацоўнікі раённага гісторыка-краязнаўчага музея і кафедры музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, краязнаўцы, музейныя работнікі з Вілейкі) сабраліся на Цэнтральнай плошчы каля будынка райвыканкама, каб урачыстым ускладаннем кветак да магілы К. Тышкевіча пачаць мерапрыемства. Затым яны наведалі знакавыя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Тышкевічаў, а менавіта: касцёл, пабудаваны на месцы, дзе раней знаходзілася крыпта роду, царкву Св. Мікалая і цудадзейную крынічку каля яе, будынак колішняй палатнянай фабрыкі і рэшткі палаца, у якім крыху больш за паўтара стагоддзя таму размяшчаўся першы на тэрыторыі Беларусі музей.

На пленарным пасяджэнні выступілі Г. Драгунова – намеснік старшыні Лагойскага райвыканкама, А. Смолік – загадчык кафедры культуралогіі БДУКіМ, П. Вабішчэвіч – начальнік аддзела культуры Лагойскага райвыканкама. Потым удзельнікі канферэнцыі разышліся па секцыях (іх было 2 – гісторыі і археалогіі і краязнаўчая). Адпаведную атмасферу стваралі малюнкі і карціны ўдзельнікаў «Тышкевіцкага пленэру», які напярэдадні прайшоў у Лагойску.

У секцыі гісторыі і археалогіі свае даклады прадставілі С. Жыгунова («Віленскі музей старажытнасцяў»), І. Колабава («Нумізматычная калекцыя Лагойскага музея Тышкевічаў»), А. Нароўская («Гравюры ў мастацкай калекцыі К. і Я. Тышкевічаў»), А. Паўлава («Дакументы роду Тышкевічаў»), А. Трусаў («Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў»), Г. Карпечанка («Канстанцін Тышкевіч і паўстанне 1830–1831 гг.»).

У секцыі краязнаўства вялікую цікавасць выклікалі даклады І. Бамбешкі «Экспедыцыйнае даследаванне Лагойшчыны ў 1923 г.» і М. Петуха «Вялля – крыніца жыцця», якія суправаджаліся паказам слайдаў, а таксама паведамленне М. Міхалевіча і В. Кастэнкі «Корчмы ў кнізе К. Тышкевіча “Вілія і яе берагі”» (на жаль, В. Кастэнка па трагічнай выпадковасці не дажыў да канферэнцыі, у якой так хацеў узяць удзел).

Кожны з удзельнікаў мерапрыемства атрымаў на памяць карту Лагойскага раёна, буклет, выдадзены кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУКіМ спецыяльна да гэтага дня асобнік зборніка «Другія Тышкевіцкія чытанні».

Завяршылася канферэнцыя круглым сталом, на якім было вырашана наступныя «Тышкевіцкія чытанні» правесці ў Вілейцы.

***Дзіяна РАМАДЗІНА,***
***старшы навуковы супрацоўнік***
***Лагойскага гісторыка-краязнаўчага***
***музея імя К. і Я. Тышкевічаў***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ